# Матэрыялы да 30-годдзя БССР

Дзяржаўная бібліятэка імя Леніна ў дапамогу дакладчыкам арганізавала кніжную вітрыну з матэрыяламі да 30-годдзя БССР.

Дакладчыкі маюць магчымасць азнаёміцца са шматлікімі артыкуламі, надрукаванымі да 30-годдзя БССР у розных выданнях. Артыкулы расказваюць аб падрыхтоўцы і правядзенні Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі на Беларусі, аб Леніне і Сталіне — стваральніках Беларускай савецкай дзяржавы, аб прабыванні М. В. Фрунзе ў Мінску і яго ролі ў падрыхтоўцы Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Многа матэрыялаў адлюстроўваюць дасягненні беларускага народа ў аднаўленні народнай гаспадаркі, у развіцці навукі, літаратуры і мастацтва.